Метадалагічныя і метадычныя аспекты выкладання мовы і літаратуры ў школе і ВНУ: зб. навук. арт. / пад рэд. Л.А. Мурынай. – Мінск: БДУ, 2005. – Вып. 4. – С. 76

***І. М. Саматыя***

# ПРАБЛЕМА ДЫЯГНОСТЫКІ ЎЗРОЎНЮ ЭТНАКУЛЬТУРНАЙ КАМПЕТЭНЦЫІ (на прыкладзе 9-га класа)

Ніхто не будзе спрачацца з меркаваннем, што ў структуры і змесце кожнай нацыянальнай мовы ўвасабляюцца сляды думак бацькоў, дзядоў, прадзедаў і прашчураў, іх жыццёвая псіхалогія і філасофія. Так гаварылі, так гавораць... Так думалі, так думаюць... Так сустракалі родных, суседзяў... Так высвятлялі адносіны з тымі, хто думае інакш...

Мова народа, якая абслугоўвае суайчыннікаў, што стагоддзямі жывуць на той ці іншай тэрыторыі, з'яўляецца люстэркам нацыянальнай культуры, формай яе існавання, яе абаронцай . Іменна яна – мова – з'яўляецца сродкам захавання этнічнай памяці і гуманных нацыянальных традыцый, пад уздзеяннем якіх вякамі фарміравалася і фарміруецца духоўнасць людзей, што дапамагала і дапамагае ім выходзіць з самых цяжкіх выпрабаванняў, захоўваць сваю супольнасць.

У раздзеле “Роднае слова – крыніца развіцця асобы і дыдактычны сродак” сваёй апошняй манаграфіі [1, с. 15] В. У. Протчанка аналізуе закон эвалюцыі свядомасці людзей: "Без этнічнай памяці няма традыцый, без традыцый – культуры, без культуры – духоўнасці, без духоўнасці – выхавання, без выхавання – асобы**, а без асобы -- кансалідаванага грамадства, здольнага вытрымаць любыя павароты гісторыі**". (выдзелена мною. – І. С.). Сваімі разважаннямі шаноўны вучоны-метадыст заклікае педагагічную грамадскасць не пакідаць па-за ўвагай , арганізуючы навучальны працэс па беларускай мове, этнакультурны кампанент. Прафесар В. У. Протчанка напамінае нам ісціну: "Чым вышэй узровень этнічнай культуры людзей, тым вышэй іх агульная духоўная культура, тым яны больш крытычна глядзяць на свае ўчынкі і паводзіны. <...> Толькі той народ, які адчувае адказнасць за лёс сваёй культуры , заслугоўвае пашану з боку іншых народаў і нацый".

Знакамітыя (адукаваныя, разумныя) людзі заўсёды бачылі прызначэнне моў і культуры ў тым, каб гуманізаваць свет і адносіны людзей у ім. Роднае слова – гэта тое культурна-гістарычнае асяроддзе, якое фарміруе асобу, здольную авалодаць духоўным багаццем свайго народа і ўсяго чалавецтва, сукупнай культурай у яе навукова-тэхнічным, эканамічным і бытавым аспектах.

У праграме па беларускай мове – асноўным дакуменце, якім вызначаюцца мэты, змест і аб'ём моўнай адукацыі – адзначаецца, што "неабходна так наладжваць навучальны працэс, каб моўная адукацыя садзейнічала засваенню культуры беларускага народа, а адным з галоўных накірункаў у

рабоце настаўнікаў стала фарміраванне вучня як моўнай асобы – носьбіта мовы, яе творцы, суб’екта, які любіць роднае слова, беражэ яго і карыстаецца ім перш-наперш як інфарматыўным сродкам ва ўсіх сферах жыццядзейнасці" [2]. У многіх метадычных распрацоўках і афіцыйных паперах дэкларуецца, што ў школе родную мову варта вывучаць не толькі як знакавую сістэму і сродак абмену думкамі. Аднак на практыцы пакуль што асноўная ўвага пры вывучэнні нашага прадмета засяроджваецца на фарміраванні моўнай кампетэнцыі (як таго вымагае форма выніковага кантролю за курс сярэдняй школы). Часу на фарміраванне камунікатыўнай кампетэнцыі на ўроку нестае. Па-за ўвагай застаецца і фарміраванне этнакультурнай кампетэнцыі.

На нашу думку (гэта пацвярджаецца нашымі эксперыментальнымі дадзенымі і дадзенымі іншых даследчыкаў [3, с. 55]), калі ў школьнікаў не фарміраваць названы від кампетэнцыі, то яго ўзровень будзе вельмі нізкім і у класах з базавым узроўнем навучання беларускай мове, і ў класах з павышаным і паглыбленым узроўнем.

Праграма па беларускай мове для 9-га класа школ з базавым і павышаным ўзроўнем навучання (12-гадовы тэрмін навучання) прадугледжвае падрыхтоўку і напісанне наступных творчых прац: апавяданне пра экскурсію ў лес (на луг, рэчку, у **музей**); аналіз тэкстаў з апісаннем **гістарычнай падзеі**; сачыненне публіцыстычнага стылю з апісаннем **помніка гісторыі ці культуры** (выдзелена мною. – І. С.). Праца па фарміраванні этнакультурнай кампетэнцыі праводзілася (як таго патрабуе праграма) і ў папярэдніх класах, таму настаўніку пажадана мець інфармацыю пра зыходны ўзровень уяўленняў дзевяцікласнікаў па акрэсленых тэмах,каб правільна арганізаваць наступны этап навучання. З гэтай мэтай можна прапанаваць вучням пытанні і заданні (на лістах, якія маюць форму старонкі сшытка на друкаванай аснове) прыкладна такога зместу.

1. Уявіце сабе наступную сітуацыю: вашаму класу даручылі напісаць дзіцячую энцыклапедыю пра людзей беларускай культуры. Пра каго б вы напісалі (запішыце два-тры прозвішчы прадстаўнікоў беларускай культуры, пра якіх вы маеце дастатакова звестак):

а) пісьменнікі:____________________________________________;

б) мастакі: ________________________________________________;

в) архітэктары,скульптары:

__________________________________________________________;

г) кампазітары:____________________________________________;

д) знакамітыя людзі беларускай культуры і гісторыі:

__________________________________________________________.

2.Дапішыце фразу:

а) Беларуская мова – гэта люстэрка беларускай культуры, таму што

_____________________________________________________________

_____________________________________________________

___________________________________________________________

б) Беларуская мова – гэта жыватворная крыніца беларускай культуры, таму што

___________________________________________________________________
___________________________________________________________________
___________________________________________________________________

в) Беларуская мова – гэта спосаб перадачы дасягненняў культуры ад аднаго пакалення да другога, таму што

___________________________________________________________________
___________________________________________________________________
___________________________________________________________________

г) Беларуская мова – гэта асобае павелічальнае шкло, якое паказвае нам

___________________________________________________________________
___________________________________________________________________
___________________________________________________________________

д) Беларуская мова – гэта ўмова беларускай культуры, таму што

___________________________________________________________________
___________________________________________________________________
___________________________________________________________________

**3**. Вам патрэбна напісаць сачыненне аб творы ці прадмеце беларускай культуры. Аб чым бы вы напісалі? Назавіце адзін, два-тры творы ці прадметы, пра якія вы можаце напісаць сачыненне:

1) музычны твор_______________________________________________;
2) твор жывапісу______________________________________________;
3) твор архітэктуры, скульптуры
_____________________________________________________________;
4) твор народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва
_____________________________________________________________;
5) твор іканапісу______________________________________________;
6) прадмет нацыянальнага побыту_____________________________;
7) прадмет нацыянальнай вопраткі____________________________;
8) прыказка,прымаўка, устойлівы выраз
_____________________________________________________________;
9) формула маўленчага этыкету_______________________________;
10) слова беларускай мовы_________________________________.

**4.** Выкажыце сваю думку па адной з наступных праблем:

1) Ці з’яўляецца беларуская мова каштоўнасцю, якую неабходна захоўваць і берагчы?

2) Якія каштоўнасці культуры важныя для чалавека?

3) Ці патрэбна захоўваць культурныя каштоўнасці, каб перадаць іх нашчадкам?

4) Францішак Багушэвіч заклікаў беларусаў: "Не пакідайце ж мовы беларускай, каб не ўмёрлі!" Ці згодны вы з ім? Сваю думку абгрунтуйце.

5) У чым заключаецца багацце беларускай мовы?

**5.** Чым здзівілі вас пытанні, на якія вы адказвалі? Аб чым прымусіла задумацца выкананая праца? Коратка напішыце пра гэта.

Пры гэтым неабходна адзначыць, што роля і значэнне прапанаванага комплексу заданняў значна шырэйшая, чым проста дыягностыка. Акрамя таго, што комплекс заданняў выконвае **дыягнастычную функцыю,** дазваляе высветліць зыходны і дасягнуты ўзроўні этнакультурнай кампетэнцыі дзевяцікласнікаў, ён выконвае **навучальную функцыю**, паколькі заданні і пытанні даюць школьнікам пэўную культуразнаўчую інфармацыю; выконвае **кантрольную функцыю,** правяраючы наяўнасць канкрэтных ведаў, уменняў і светапоглядных установак школьнікаў; выконвае **функцыю актуалізацыі ведаў** і асацыяцый, звязаных з культурай свайго народа; выконвае **выхавальную функцыю,** арыентуючы вучняў не толькі на прэзентацыю сваіх ведаў пра мову і культуру народа, але і на роздум, які мае на ўвазе выяўленне і абгрунтавананне сваіх адносін да беларускай культуры.

***Літаратура***

1. *Протчанка В. У.* Актуальныя праблемы тэорыі і практыкі навучання беларускай мове. Мн., 2002.

2. Праграмы сярэдняй агульнаадукацыйнай школы з беларускай мовай навучання: Беларуская мова: 5–9 класы. Мн., 2000.

3. *Новикова Л. И.* Проблема диагностики уровня культуроведческой компетенции учащихся // Рус.словесность. 2005. №7. С. 49–55.